*П.Р.ІГНАТОВІЧ*

# АНТРАПАКУЛЬТУРАЛАГІЧНАЯ ПАРАДЫГМА АДУКАЦЫІ

Чалавецтва ўступіла ў трэцяе тысячагоддзе. І гэта не проста сімвалічна, а звязана з надзвычай важнымі зменамі. XX ст. з яго бурным развіццём ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці, развіццём электроннай тэхнікі, узнікненнем новых ведаў мастацтва, уцягненнем вялікіх мас народа ў неспасрэдныя зносіны з разнастайнымі культурнымі феноменамі ўнесла многа нязвыклага ў функцыянаванне і дынаміку сацыякультурнай рэальнасці.

Адбыліся геапалітычныя змены, сфарміраваўся аднапалярны свет. Значныя змены адбыліся з прычыны распаду СССР. У краінах, узніклых на тэрыторыі некалі магутнай дзяржавы, ідуць трансфармацыйныя працэсы, якія ацэньваюцца неадназначна рознымі сацыяльнымі слаямі і палітычнай элітай. Разгортваюцца так званыя працэсы глабалізацыі. Калі прааналізаваць сучаснае рэфармаванне на постсавецкай прасторы, то можна адзначыць, што яно ахоплівае галоўным чынам эканоміку. Тым самым у аснове рэфармавання грамадства пануюць эканамічны матэрыялізм і дэтэрмінізм. Але ж жыццё чалавека не абмяжоўваецца гаспадарчай дзейнасцю, паколькі апошняя – толькі частка жыцця. Чалавек забяспечвае дастойнае жыццё, набываючы эканамічную свабоду, асэнсоўвае жыццё толькі ў цэласным і гарманічным грамадстве. Пераходзячы да рыначных адносін, нельга не звяртаць увагі на галоўнага іх суб’екта – самога чалавека.

Усякі працэс грамадскага развіцця абумоўлены унікальным спалучэннем мноства фактараў, але ў цэнтры іх знаходзіцца чалавек, які стварае эканоміку.

На жаль, рэформы апошніх гадоў стварылі ў краінах, узніклых на тэрыторыі былога СССР, эканоміку не цывілізаванага, а дзікага рынку, у якім дамінуе спекулятыўны капітал, а даход у пасрэдніцкай дзейнасці значна перавышае даход у сферы вытворчасці.

Перавага размеркавальных і пераразмеркавальных тэндэнцый над вытворчымі не стварае неабходных умоў для ўкаранення якаснай працы ў розных сферах дзейнасці, без чаго немагчымы рух краіны да постіндустрыяльнага грамадства. Вось чаму важна зразумець, што развіццё грамадскай вытворчасці больш за ўсё залежыць ад таго, у якой сацыяльнай якасці ў яе ўваходзіць чалавек, наколькі раскрыты яго духоўныя патэнцыі. Самі сацыяльныя якасці чалавека набываюцца перш за ўсё ў культурным адукацыйным працэсе, на базе тых каштоўнасцей, маральных крытэрыяў, якія мае грамадства. І тут, безумоўна, галоўная роля належыць гуманітарнай сферы дзейнасці – адукацыі, культуры. Культура ў шырокім разуменні параджае духоўнасць і творчасць, цэласнае і гарманічнае ўспрыманне жыцця, яго дасканаласць і сэнс.

Усведамленне прынцыповай нелінейнасці сацыяльнага і псіхічнага развіцця, незамкнёнасці знешняга і ўнутранага свету, нераўнамернасць натуральнага стану любой жывой сістэмы дазваляе сцвярджаць аб змене парадыгмы нашага мыслення, аб пераасэнсаванні адносін чалавека з навакольным светам і аднаго з адным, востра ставіць пытанне аб маральных каштоўнасцях як сутнасці культуры, аб маральным як адзіным шансе на выжыванне і развіццё.

Гэта значыць, што культура, навука, адукацыя, ахова здароўя, а з імі і сам чалавек не могуць знаходзіцца за межамі рэформаў. Рэформы павінны закранаць усе віды чалавечай дзейнасці, усе бакі грамадскага жыцця – ад мовы культуры да эканомікі і экалогіі, ад палітыкі да маральнасці. Пры гэтым усе віды чалавечай дзейнасці ў сваёй сукупнасці, знаходзячыся паміж сабой у пэўным прыярытэтным стане, складаюць не механічна “склеенае” цэлае, а арганічную сістэму.

На сучасным этапе развіцця чалавецтва з’явіўся шэраг праблем, што датычацца выбару стратэгій адукацыйных сістэм, пошуку аптымальных мадэляў навучання, адэкватных часу.

Сведчаннем злабадзённасці праблемы адукацыі з’яўляецца вялікая цікавасць да яе з боку сусветнай супольнасці. Напрыклад, пачынаючы з 1997г. кожны год у розных канцах свету праводзяцца канферэнцыі і кангрэсы.

У рамках рэалізацыі рашэнняў сусветнай канферэнцыі па навуцы (Будапешт, 1999 г.) і сусветнага адукацыйнага форума (Дакар, 2000 г.) 3—6 кастрычніка 2000 г. у г. Мінску праведзены міжнародны кангрэс на тэму “Навука і адукацыя на парозе III тысячагоддзя”. На кангрэсе абмеркаваны перспектывы развіцця як навукі, так і адукацыі. Чалавецтва ніколі не мела такіх бурных тэмпаў тэхналагічнага росту, як за апошняе тысячагоддзе. І ключавымі тут з’яўляюцца інфармацыйная рэвалюцыя і глабалізацыя. Чырвонай ніткай на гэтых кангрэсах праходзіла ідэя аб

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходнасці дасягнення сацыяльнай справядлівасці, грамадскага спакою і стабільнасці пры дапамозе адукацыі.

Яшчэ ў 1974 г. удзельнікі пасяджэння Рымскага клуба зрабілі прагноз адносна перспектыў XXI ст. і прыйшлі да вываду, што гэты век будзе векам адукацыі. Паводле прагнозаў амерыканскіх сацыёлагаў ужо у 2015 г. максімальная колькасць занятага насельніцтва ў США – каля 23 % — будзе працаваць у сферы адукацыі. Такія тэндэнцыі характэрныя і для іншых краін, аднак яны ў розных краінах і рэгіёнах праходзяць у розныя тэрміны. У цэлым у свеце да сярэдзіны XXI ст. насельніцтва сапраўды больш за ўсё будзе занята ў адукацыі.

Глабальнай праблемай, якая хвалюе зараз вучоных, педагогаў, грамадскасць розных краін, з'яўляецца змена парадыгмаў адукацыі.

Антрапалагічная і культуралагічная парадыгмы складаюць новыя супермадэлі, метадалагічныя ўзоры, якія сёння крытычна асэнсоўваюцца вучонымі свету. Магістральны кірунак рэалізацыі антрапакультуралагічнай парадыгмы – гуманізацыя і гуманітарызацыя адукацыі.

Адной з сусветных тэндэнцый у агульным кантэксце антрапацэнтрызму XX ст. з'яўляецца гуманізацыя ўсіх ступеняў адукацыі, у тым ліку шматузроўневай сістэмы вышэйшай адукацыі.

Трэба адзначыць, што рост цікавасці да гуманітарных праблем, праблем культуры і сацыяльнай рэгуляцыі, калектыўнага і прыватнага жыцця людзей характэрны для ўсёй сусветнай навукі апошняга стагоддзя і звязаны са шматлікімі гістарычнымі і сацыякультурнымі прычынамі, а таксама з развіццём самой метадалогіі пазнання. Гэта выклікана ўключэннем у арбіту міжнароднага культурнага жыцця народаў "трэцяга свету", разрастаннем працэсаў сацыякультурнага развіцця з рэгіянальных у глабальныя, станаўленнем мультыкультурнай постіндустрыяльнай цывілізацыі, зменай характару ўзаемаадносін чалавечай асобы з соцыумам, пошукам сродкаў "культурнай адаптацыі" чалавека ў дасягненнях тэхнагеннага свету і інфармацыйнай цывілізацыі, разбурэннем многіх асноў традыцыйнага жыццёвага ўкладу і карціны свету людзей, з'яўленнем і распаўсюджваннем феномена масавай культуры, зменай філасофскіх парадыгмаў у светапоглядзе, узрастаннем "антрапалагічнасці" навукі. Усё гэта стымулявала ў большасці краін свету развіццё комплексу культурна-антрапалагічных навук, якія вывучаюць названыя працэсы.

У асабліва складаным становішчы знаходзяцца краіны, што ўтварыліся на постсавецкай прасторы, уключаючы Беларусь, Расію і іншыя краіны СНД, якія да гэтага часу ідуць нязведаным шляхам трансфармацыі грамадства, ломкі грамадскіх устояў. Тое, што сёння лібералы называюць рэфармаваннем, іх апаненты называюць развалам, дэградацыяй. Адным словам, працэсы, якія адбываюцца, рознымі грамадскімі коламі ацэньваюцца неадназначна і супярэчліва.

Відавочная змена парадыгмаў адукацыі сведчыць аб тым, што свет вельмі змяніўся (груз глабальных праблем, вялікі разрыў у тэмпах развіцця асобных рэгіёнаў свету і інш.). Увогуле ў XX ст. назіралася інтэнсіўная змена базавых прынцыпаў грамадскага развіцця. Але аб'ектыўна ўсе яны натхняюцца поспехамі навукі. Зараз, у пачатку XXI ст., з'яўляецца відавочным зварот да ведаў.

Сучасныя тэндэнцыі ў адукацыі прыводзяць да таго, што сама адукацыя і яе вынікі ў многім звязаны з гуманітарнымі працэсамі. Гэта сведчыць аб прызнанні каштоўнасці адукацыі. Значыць, адукацыя з'яўляецца функцыяй ўсяго грамадства ў цэлым. Гэта па сутнасці канстатацыя гуманітарнага і гуманістычнага патэнцыялаў адукацыі.

Сусветная практыка сведчыць, што гуманітарная адукацыя з'яўляецца вельмі добрай нішай для падрыхтоўкі кіруючых кадраў (акрамя непасрэднага прызначэння гуманітарыяў). На першы погляд падаецца парадаксальным, як заняткі філасофіяй, сацыялогіяй, правам, псіхалогіяй могуць сфарміраваць важны элемент тэхналагічных працэсаў. Але класічная гуманітарная адукацыя закладвае базавыя інтэлектуальныя каштоўнасці, узнаўляе не толькі навыкі атрымання канкрэтных ведаў, але здольнасць і патрэбнасць у пастаянным узнаўленні ведаў. Дададзім сюды спрадвечнную маштабнасць, нестандартнасць мыслення. Лагічныя навыкі разам са свабодай мыслення садзейнічаюць развіццю творчых патэнцый. Выступаючы на пасяджэнні Рускага інтэлектуальнага клуба (верасень 1999 г.) выдатны расійскі вучоны М.М.Майсееў падкрэсліваў, што мы перажываем перыяд найглыбейшага сінтэзу прыродазнаўчых і гуманітарных дысцыплін. Прычым гэта ў асноўным датычыцца вышэйшых навучальных устаноў. Ён прапаноўвае рыхтаваць маладых людзей да адэкватнага ўспрымання цяперашняга часу, у тым ліку і шляхам уключэння ў вучэбны працэс ВНУ пэўных дысцыплін: "Павінен быць курс, які б дазволіў людзям, перш чым слухаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

філасофію, гісторыю, перш чым вучыць інжынерныя навукі, мець яснае ўяўленне аб тым, у якім свеце мы жывём сёння. Павінны быць асновы часаразумення” [4, с. 28].

Веліч народа не вызначаецца яго колькасцю, таксама як веліч чалавека не залежыць ад яго росту. Няхай кожны народ, як і кожны чалавек, будзе сам сабой; няхай вырастае ўсё, што расце; усё і ўсе маюць права на жыццё. Але не за кошт іншых і не на шкоду іншым, не ў парушэнне іх права быць самімі сабой, права на свой выбар, на свабоднае жыццё.

У апошні час адбываюцца значныя змены ў канфігурацыі праблемных палёў практычна ўсіх гуманітарных навук. У рамках дадзенага пастулата прадстаўнікі гуманітарных навук уступілі ў этап пераасэнсавання сучасных прадметаў, што выклікала інтэнсіўнае пераразмеркаванне праблематыкі паміж прадстаўнікамі розных навук.

Сёння значная частка даследчыкаў адышла ад разумення філасофіі як навукі аб найбольш агульных законах развіцця прыроды, грамадства і чалавека. Як паказала дыскусія, арганізаваная Інстытутам філасофіі РАН і часопісам «Вопросы философии» ў сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя, многія па- дзяляюць пункт гледжання, выказаны А.Л. Нікіфаравым аб тым, што філасофія ўяўляе сабой асобы від каштоўнаснай свядомасці, да якога немагчыма прымяніць ні адзін крытэрый, які дазваляў бы аддзяліць навуку ад таго, што навукай не з’яўляецца.

Як падкрэслівае Ф.І.Мінюшаў, сучасныя сацыяльныя і гуманітарныя навукі мазаічныя. Гэта тлумачыцца паступовым пераходам да парадыгмальнай формы развіцця. Дадзеная тэндэнцыя актуалізуецца ў наш час па прычыне імклівага ўскладнення віртуальнай рэальнасці, якая ўздзейнічае праз людзей на сацыяльную рэальнасць.

Фіксуючы карціну мазаічнасці развіцця сацыягуманітарных навук, трэба мець на ўвазе, што суб’ектыўная рэальнасць і аб’ектыўная рэальнасць па сваёй прыродзе – адзіная сацыягуманітарная рэальнасць.

Парадыгма ў выглядзе матрыцы пэўнай дысцыпліны аб’ядноўвае тэарэтычнае тлумачэнне і сацыяльна-тэхналагічнае, у тым ліку культурна-інфармацыйнае рашэнне праблемы [3, 183].

Парадыгмальнае развіццё навук забяспечвае магчымасць тэарэтычнага пазнання бясконцай колькасці markdown рознай квазірэальнасці, гістарычна ўключаемай у працэсы жыццядзейнасці людзей.

Парадыгмальнае развіццё сацыягуманітарнай свядомасці тлумачыцца імкненнем навукі пераадолець спрадвечную няўзгодненасць паміж логікай несупярэчлівых тэорый (асноўнае патрабаванне фармальнай логікі) і супярэчлівым зместам рэальнасці, якую яны павінны растлумачыць. Усе сюжэты сацыяльнага жыцця рухаюцца ў сетках супярэчнасцей; навуковыя тэорыі іх могуць ахапіць толькі тады, калі яны будуць імкнуцца да аптымальнай множнасці (плюральнасці).

Акрамя таго, парадыгма тлумачыць свой аб’ект тым дакладней, чым больш ён сегментаваны, г. зн. звужана магчымасць самавольства інтэрпрэтатара. Аптымальнасць меркавання аб’екта пазнання вызначаецца ў працэсе навуковай творчасці, прычым, як паказвае вопыт, у большасці сваёй інтуітыўна.

Паходжанне тэрміна “парадыгма” ў тым значэнні, у якім ён выкарыстоўваецца сёння ў грамадазнаўстве, звязана з даследаваннямі вядомага амерыканскага метадолага Т. Куна. Як асобая навуковая катэгорыя тэрмін “парадыгма” ўведзены ім у працы “Структура навуковых рэвалюцый” (1962) для абазначэння пераважных у дзейнасці пэўнай навуковай супольнасці праблем і рашэнняў. Па сцвярджэнні Т.Куна, вучоныя працуюць у рамках парадыгмаў, якія з’яўляюцца агульнымі спосабамі бачання свету і на аснове якіх вызначаецца тое, якога характару навуковай працай трэба займацца, якія тэорыі з’яўляюцца прымальнымі. Парадыгмы робяць магчымай “нармальную навуку” – тое, чым даследчыкі займаюцца кожны дзень [2, с. 114].

“Парадыгма ўяўляе сабой класічную навуковую распрацоўку, якая ўспрымаецца прадстаўнікамі дысцыпліны ў якасці ўзору і становіцца асновай навуковай традыцыі” [1, с. 121]. Работа навукоўца ёсць работа ў рамках парадыгмы. Аднак з часам у нетрах нарматыўнай навукі складваецца рад анамалій, якія не могуць быць вырашаны ў рамках існуючай парадыгмы. Гэта так званы момант раптоўнага пералому, калі старая парадыгма замяняецца новай, што вядзе да новага перыяду функцыянавання нармальнай навукі.

Такім чынам, фарміраванне новай парадыгмы пачынаецца ва ўмовах, калі ўзнікаюць праблемы (анамаліі), якія не могуць быць вырашаны і растлумачаны ў рамках існуючай парадыгмы. Змена парадыгмаў – нешта большае, чым чаргаванне тэорый і канцэпцый, вылучаемых тымі ці іншымі аўтарытэтамі. Змена парадыгмаў ёсць змена адносін да аб’екта даследавання, якая прадвызначае змену даследчых метадаў і мэт, а часам і змену самога прадмета даследавання. Пераход ад адной

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

парадыгмы да другой можа расцягвацца на дзесяткі і нават сотні гадоў. Гэты перыяд даследчыкі называюць навуковай рэвалюцыяй – часам крушэння аўтарытэтаў, мадэляў, метадалогій, тэорый, светапоглядаў.

Якраз такі час мы зараз і перажываем. Гэта датычыцца не толькі нашай краіны, не толькі краін былога СССР. Гэты перыяд у большай ці меншай ступені перажываюць усе краіны свету. Вось чаму сёння так сур’ёзна стаіць пытанне аб змене парадыгмаў у цэлым шэрагу навуковых кірункаў.

Парадыгма – рэпрэзентатыўная культура навукоўцаў, што дзейнічаюць у яе рамках, і да таго часу, пакуль яны прызнаюць асноватворную тэорыю, яны будуць знаходзіць тэарэтычныя аргументы на яе карысць, эксперыментальныя пацвярджэнні.

Развіццё духоўных і маральных пачаткаў мінімізуе адчужэнне і, значыць, пашырае свабоду чалавека, самасцвярджае асобу, вядзе да гуманізацыі грамадскага жыцця.

Духоўнае і маральнае развіццё чалавека немагчыма без культуры, таму культурны чалавек – мэта развіцця, а эканоміка (як і сама цывілізацыя) ёсць сродак дасягнення дадзенай мэты. У гэтым сутнасць глабальнага пераходу чалавецтва да грамадства сацыяльнага гуманізму.

Вызначаючы стратэгію сучаснага гістарычнага пошуку ў дачыненні да постсавецкіх краін, неабходна ў першую чаргу сканцэнтравацца на ідэалах гуманізму, таму што гэта з’яўляецца апорай сапраўднай дэмакратыі і сацыяльнай справядлівасці ў грамадстве. У цэнтры такога гуманістычнага руху знаходзяцца сам чалавек, яго культура, адукацыя, навуковае, духоўнае і фізічнае развіццё.

Пераўтварэнні, ажыццяўляемыя ў беларускім грамадстве на этапе сістэмнай трансфармацыі, не могуць быць паспяховымі без актыўнага выкарыстання духоўна-маральнага патэнцыялу, пераадолення крызісных з’яў у адукацыі і культуры. З улікам дадзенага падыходу аптымальны варыянт дактрыны нацыянальнай адукацыі не можа не ўключаць цэлы пласт маральных каштоўнасцей. Ён павінен пранізваць увесь навучальны працэс, быць адной з галоўных мэт – арыенціраў фарміруемай сістэмы адукацыі.

---


1. *Аберкромби Н., Хилл С., Тернер Б.С.* Социологический словарь / Пер. с англ. — М.: Экономика, 1999.

2. *Ионин Л.Г.* Парадигма // Культурология XX век: Энциклопедия. — СПб.: Университетская книга, 1998. — Т. 2.

3. *Минюшев Ф.И.* Парадигмы развития гуманитарного знания в условиях виртуального общества // Личность, культура, общество. — 2001. — Т. 3. — Вып. 3 (9). — С. 183—192.

4. *Русский* интеллектуальный клуб: Стенограмма заседаний / Под науч. ред. докт. филос. наук, проф. И.М.Ильинского. — М., 2000. — С. 28


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ